# БЕЛАРУСКІЯ МУЗЕІ Ў СПРАВЕ ЗАХАВАННЯ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ



**Дзяніс Філіпчык,**
дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў БДУ, кандыдат гістарычных навук

Міжнародная супольнасць у 2023 г. будзе адзначаць дваццацігоддзе прыняцця Канвенцыі ЮНЕСКА «Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны». Пасля з'яўлення дакумента праблема захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны (НКС) застаецца актуальнай. Аб яе важнасці і агульным жаданні зберагчы нацыянальныя каштоўнасці сведчыць тое, што ў 2020 г. Канвенцыя была ратыфікавана 180 дзяржавамі [1]. Адметна, што Рэспубліка Беларусь была сярод першых дзесяці краін свету, якія зацвердзілі дакумент [2].

Да захавання «жывой спадчыны» далучаюцца розныя дзяржаўныя і недзяржаўныя арганізацыі, установы культуры, адукацыі і самі носьбіты. Але кожны ўключаецца ў працэс па-рознаму. Таму і праз два дзесяцігоддзі пасля прыняцця Канвенцыі не спыняюцца дыскусіі аб формах, метадах, мэтах удзелу розных інстытуцый у справе захавання НКС.

Міжнародная музейная супольнасць прайшла доўгі шлях асэнсавання ролі і месца музея ў працэсах дакументавання, вывучэння, інтэрпрэтацыі нематэрыяльнай спадчыны. Беларускія ўстановы не заставаліся ў баку ад агульнасусветных тэндэнцый, але іх дзейнасць мела сваю спецыфіку.

Разгледзім яе адметныя рысы і паспяховыя прыклады, пачаўшы з кароткага агляду змены музейнай парадыгмы ў дачыненні да працы з НКС.

## Нематэрыяльная спадчына і музей

Паводле Канвенцыі 2003 г. да НКС адносяцца «звычаі, формы прадстаўлення і ўяўлення, веды і навыкі, а таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы, якія прызнаюцца супольнасцямі, групамі і ў некаторых выпадках асобнымі людзьмі ў якасці часткі іх культурнай спадчыны…» [3]. Ужо само азначэнне НКС паказвае, што з «жывой спадчынай» могуць быць звязаны артэфакты, а менавіта свет рэчаў заўсёды быў у аснове музейнай дзейнасці. Таму вялікая колькасць музеяў свету працавала з НКС яшчэ да прыняцця Канвенцыі 2003 г. Але праца гэта была галоўным чынам сканцэнтравана на вывучэнні часткі спадчыны, звязанай з музейнымі калекцыямі, важнай для інтэрпрэтацыі прадметаў традыцыйнай культуры.

Навуковыя дыскусіі напярэдадні прыняцця Канвенцыі закранулі і музейную сферу. Так, удзельнікі 7-й Азіяцка-Ціхаакіянскай рэгіянальнай асамблеі Міжнароднага савета музеяў (ІКОМ) «Музеі, нематэрыяльная спадчына і глабалізацыя» (Шанхай, 2002) прынялі так званую Шанхайскую хартыю адносна ролі музеяў у захаванні НКС. У дакуменце адзначана «…важнасць творчасці, адаптыўнасці і самабытнасці народаў, месцаў і супольнасцяў як межаў, у якіх каштоўнасці, традыцыі, мовы, вусная гісторыя, народнае жыццё і г.д. прызнаюцца і папулярызуюцца ва ўсіх музеязнаўчых практыках і практыках спадчыны» [4]. Тэкст Шанхайскай хартыі заклікаў таксама разглядаць музеі як «пасрэднікаў канструктыўнага партнёрства ў ахове гэтай спадчыны чалавецтва» [4].

Важнасць асэнсавання ролі музея ў захаванні НКС паказвае і тое, што Міжнародны дзень музеяў у 2004 г. прайшоў пад дэвізам «Музеі і нематэрыяльная спадчына». Такой жа тэме была прысвечана 20-я Генеральная канферэнцыя ІКОМ у Сеуле. У выніку з'явілася Сеульская дэкларацыя ІКОМа аб нематэрыяльнай спадчыне, у якой усе адпаведна падрыхтаваныя музеі заклікаліся да «ўдзелу ў зборы, захаванні і папулярызацыі нематэрыяльнай спадчыны» [5].



Веткаўскі музей стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава. Супрацоўнікі музея падчас экспедыцыі



Івянецкі музей традыцыйнай культуры. Ганчар за працай у музеі



Летняя школа «Майстэрня» падвойнага ткацтва ў Гудзевіцкім дзяржаўным літаратурна-краязнаўчым музеі



Івянецкі музей традыцыйнай культуры. Занятак па лепцы



Летняя школа «Майстэрня» падвойнага ткацтва ў Гудзевіцкім дзяржаўным літаратурна-краязнаўчым музеі



Мотальскі музей народнай творчасці.
Майстар-клас па ўпрыгожванні вясельнага каравая

Былі ўнесены змены ў само азначэнне паняцця «музей». У рэдакцыі ІКОМа 2007 г. яно мела наступны выгляд: «Музей – гэта пастаянная некамерцыйная ўстанова, закліканая служыць грамадству і спрыяць яго развіццю, даступная шырокай публіцы, якая займаецца набыццём, захоўваннем, даследаваннем, папулярызацыяй і экспанаваннем матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны чалавецтва і асяроддзя яго пражывання з мэтай вывучэння, адукацыі, а таксама для задавальнення духоўных патрабаванняў» [6]. Уключэнне паняцця НКС у дадзенае азначэнне пашырае сферу дзейнасці музеяў, дадаючы туды і нематэрыяльную спадчыну. Але абмежавацца простым пераносам усіх аспектаў работы з матэрыяльнай спадчыны на НКС было б не зусім правільна. Таму праблемы выпрацоўкі новай музейнай парадыгмы ў адносінах да апошняй застаюцца актуальнымі і сёння.

## Дакументаванне і вывучэнне «жывой спадчыны»

Функцыя дакументавання – адна з базавых у музеях. Першасная фіксацыя ўзораў нематэрыяльнай спадчыны можа стаць падставай для далейшага яе вывучэння, выкарыстання ў экспазіцыйна-выставачнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці. Але дакументаванне «жывой» спадчыны, якая, як правіла, не трапляла першапачаткова пад увагу музейных работнікаў, з’яўляецца няпростай задачай.

У Аператыўным кіраўніцтве па выкананні Канвенцыі 2003 г. зазначана, што «Навукова-даследчыя ўстановы, спецыялізаваныя цэнтры, музеі, архівы, бібліятэкі, дакументацыйныя цэнтры і іншыя аналагічныя структуры адыгрываюць важную ролю ў пытаннях збору, дакументавання, архівацыі і захавання дадзеных аб нематэрыяльнай культурнай спадчыне, а таксама ў справе прадстаўлення інфармацыі і павышэння асвядомлёнасці аб яе важным значэнні» [3].

Беларускія музеі актыўна займаліся дакументаваннем НКС падчас здзяйснення музейных экспедыцый. Прычым у XXI ст. матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне ўжо дазваляла не толькі апісваць элементы, але і ствараць адпаведныя базы дадзеных, дзе захоўваліся фота-, аўдыё-, відэадакументы, якія з’яўляліся аўдыёвізуальнай фіксацыяй.

Напрыклад, супрацоўнікі Мотальскага музея народнай творчасці займаліся дакументаваннем і вывучэннем спадчыны цэлага рэгіёна. У 1991–2016 гг. штогод наладжваліся экспедыцыі ў Пінскі, Іванаўскі, Драгічынскі раёны. Даследчыкі не абмяжоўваліся зборам прадметаў і камплектаваннем этнаграфічных калекцый, але занатоўвалі абрады каляндарнага цыкла, сямейна-радзінную абраднасць, распаўсюджаную ў рэгіёне (Каляды, Купалле, Жніво, Вяселле, Каравайны абрад, Прыданы, Свахі і інш.) [7].

Такая дзейнасць вельмі важная для перспектыў захавання НКС. Напрыклад, у 2004 г. супрацоўнікі Музея традыцыйнай культуры (Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў) здзейснілі экспедыцыю ў в. Рычаны. Там былі выяўлены шматлікія тканыя вырабы ў тэхніцы «сінель», якая ў свой час была характэрна для гэтых мясцін. Больш таго, знайшліся носьбіты гэтай тэхналогіі – майстры. З дапамогай аднаго з іх (Э.У. Пецюкевіча) музейныя спецыялісты запісалі тэхналогію і яе мясцовыя асаблівасці [8]. Па матэрыялах экспедыцыі і на падставе вывучанай літаратуры тэхналогія была адроджана і перадавалася ў межах гуртка па ткацтве, што дзейнічаў пры музеі. Прыклад Браслаўскага раённага аб'яднання музеяў паказвае, наколькі важным і неабходным для захавання НКС з'яўляецца яе дакументаванне.

Асаблівага поспеху музеі дасягалі, калі фіксацыя вялася на пастаяннай аснове, уключалася ў адпаведныя планы. Напрыклад, з 1998 г. Веткаўскі музей стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава рэалізоўваў праграму комплексных экспедыцыйных даследаванняў рэгіёна пад назвай «Па шляхах старажытных радоў». Экспедыцыі праходзілі ў 1998 г. па р. Бесядзь, у 1999 г. – па р. Сож, у 2001 г. – па р. Іпуць, у 2002–2003 гг. – у міжрэччы Бесядзі і Іпуці [9].

Рэалізоўваўся музеем доўгатэрміновы праект фотафіксацыі драўлянага народнага дойлідства і дамавой архітэктурнай разьбы ў Веткаўскім, Добрушскім, Гомельскім раёнах і ў памежных населеных пунктах Расійскай Федэрацыі. За першыя тры гады рэалізацыі праграмы было абследавана цалкам 28 населеных пунктаў, 37 – часткова, зафіксавана звыш 2050 аб'ектаў драўлянага народнага дойлідства. Паралельна з фотафіксацыяй адбывалася дакументаванне элементаў НКС, звязаных з разьбой і ўпрыгожваннем жылля: тэхналагічныя асаблівасці, абрады, уяўленні. Фондавыя калекцыі камплектаваліся прыладамі працы майстроў, арнаментальнымі трафарэтамі і г.д.

Актыўная праца вялася і вядзецца ў Гудзевіцкім дзяржаўным літаратурна-краязнаўчым музеі. Вынікам экспедыцыйнай дзейнасці на пачатку 1990-х гг. стала дакументаванне тэхналогіі падвойнага ткацтва дываноў і яе далейшае засваенне супрацоўнікамі музея, што дазволіла захаваць дадзены элемент НКС, уключыць яго ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Пазней этнаграфічныя экспедыцыі здзяйсняліся з мэтай вывучэння Мастоўскага (2011–2013 гг.), Бераставіцкага (2014 г.) і Ваўкавыскага (2014 г.) раёнаў [10].

Важна не толькі зафіксаваць элементы НКС, сабраць артэфакты, звязаныя з ёй, але і адпаведным чынам іх даследаваць. Пры гэтым магчыма вылучыць некалькі накірункаў. Найперш – праца з музейнымі прадметамі і калекцыямі, звязанымі з НКС. Хаця самі яны не з'яўляюцца нематэрыяльнай спадчынай, але без іх вывучэння, сістэматызацыі і захавання немагчыма стварыць навукова абгрунтаванае прадстаўленне элементаў нематэрыяльнай спадчыны ў экспазіцыі, распрацаваць музейна-педагагічныя праграмы, падрыхтаваць выставы і інш.

Не ўсе музейныя ўстановы аднолькава добра арганізуюць навукова-даследчую работу, тым больш тую, што звязана з НКС. Але сустракаюцца і надзвычай удалыя прыклады, калі на базе музеяў перыядычна праходзяць навуковыя канферэнцыі і круглыя сталы, рыхтуюцца асобныя тэматычныя выданні ці нават матэрыялы для надання элементам НКС статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Так, у выніку даследчай дзейнасці спецыялістаў Мотальскага музея народнай творчасці пад кіраўніцтвам дырэктара В.Р. Кульбеды былі падрыхтаваны і прадстаўлены матэрыялы дасье на ўнясенне ў Дзяржаўны спіс элемента НКС «Вясельная каравайная традыцыя вёскі Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці». У выніку дадзены элемент быў уключаны ў Дзяржаўны спіс у 2016 г. [11]. Прыклад Мотальскага музея народнай творчасці паказаў, што ўзровень навукова-даследчай работы і кваліфікацыя музейных спецыялістаў дазвалялі ім удзельнічаць у папаўненні Нацыянальнага інвентара НКС. Неабходна канстатаваць, што падобныя прыклады ў беларускай музейнай практыцы былі адзінкавымі, у той час як у некаторых краінах (Венгрыя, 2009 г.) на базе музейных устаноў ствараліся кірую-

чыя органы ў сферы нематэрыяльнай спадчыны, вяліся нацыянальныя інвентары НКС [12].

## Экспазіцыя і нематэрыяльная спадчына

Экспазіцыя з'яўляецца асноўным пасярэднікам, з дапамогай якога ў музеі ажыццяўляецца працэс камунікацыі. Таму вельмі важна ўключаць у экспазіцыйна-выставачную прастору элементы НКС. Але гэта вельмі складаная задача, паколькі «жывая спадчына» без носьбіта не існуе.

Адзін з эфектыўных спосабаў яе прадстаўлення ў экспазіцыі – стварэнне пры музеях дзеючых майстэрняў, у якіх ёсць не толькі інструменты рамесніка і гатовыя вырабы, але і магчымасць дэманстрацыі самой тэхналогіі носьбітам-майстрам.

У 2008 г. на правах філіяла Столінскага раённага краязнаўчага музея ў в. Гарадная адчыніўся музей-сядзіба, дзе быў адноўлены інтэр'ер майстэрні ганчара і яго жылля. Сярод іншага наведвальнікі маглі бачыць ганчарнае кола, месца захоўвання гатовых вырабаў, печ для абпальвання посуду, горн і інш. Атрымаўся інтэрактыўны музей, які дазваляе наведвальнікам паўдзельнічаць ва ўсім тэхналагічным працэсе стварэння посуду з гліны, тым самым спрыяючы захаванню і актуалізацыі НКС [13].

Пры Музеі народнай творчасці «Бездзежскі фартушок» з 2012 г. дзейнічае асобная экспазіцыя ў выглядзе сялянскага падворка «Каля Плэса», створанага ў межах абласной праграмы захавання і развіцця культуры Брэсцкай вобласці. Па сутнасці, гэта рэканструкцыя сялянскага двара пачатку XX ст., якая знаёміць з інтэр'ерам хаты, асноўнымі сельскагаспадарчымі заняткамі, мясцовай культурай харчавання і традыцыйнымі стравамі. Варта адзначыць, што падворак прадастаўляе паслугі па размяшчэнні і харчаванні турыстаў [7], тым самым спрыяючы атрыманню эканамічнай выгады. Экспазіцыя «Каля Плэса» дапаўняла асноўную, пабудаваную сістэматычным метадам, што дазволіла праз адлюстраванне характэрнай і асаблівай НКС вёскі і наваколля стварыць інтэрактыўную прастору і якасна прадставіць нематэрыяльную спадчыну.

З майстэрнямі звязана і экспазіцыя Музея традыцыйнай культуры Браслаўскага раённага аб'яднання музеяў (1997 г.). Падчас яе праектавання быў выкарыстаны тэматычны падыход, але прадметы не проста згрупавалі адпаведным чынам і прадставілі ў вітрынах, а спалучылі іх з дзеючымі майстэрнямі. Атрымалася, што носьбіты элементаў НКС упісаліся ў экспазіцыйную прастору, з'явіліся яе арганічнай часткай. Майстры дэманструюць характэрныя для рэгіёна рамёствы: пляценне, разьбу па дрэве, ткацтва, ганчарства [14]. Музейныя прадметы адбіраліся так, каб яны не толькі адлюстроўвалі гісторыю рамяства і саму тэхналогію, але і паказвалі яго непарыўную сувязь з сённяшнім днём, яго запатрабаванасць. Таму побач з рэчамі XIX – пач. XX стст. знаходзяцца таксама сучасныя вырабы мясцовых майстроў.

Музейны досвед паказвае, што рамёствы найчасцей і найлепш адлюстроўваюцца ў музейных экспазіцыях у параўнанні з іншымі галінамі НКС. А вось міфалогію, выканальніцкія мастацтвы, традыцыйныя цырымоніі адлюстраваць музейнымі сродкамі не так і проста. Але і дадзеныя вобласці знаходзяць сваё ўвасабленне ў музейных рашэннях экспазіцыйна-выставачных прастораў.

У музеі «Палеская веда» (Мазырскі аб'яднаны краязнаўчы музей) у 1999 г. была арганізавана сюжэтна-вобразная экспазіцыя, якая адлюстроўвала багатую нематэрыяльную спадчыну рэгіёна. Стваральніца яе навуковай канцэпцыі – А.Б. Сташкевіч – імкнулася пазнаёміць наведвальніка з сістэмай практычных, міфалагічных, астралагічных, фальклорных ведаў пра Сусвет і існаванне ў ім чалавека, якія былі характэрны для Мазырскага рэгіёна. Экспазіцыя пачынаецца інсталяцыяй, якая сімвалізуе парог, мяжу светаў і прыводзіць у наступную залу, у інтэр'ер сялянскай хаты. Расказ аб ім спалучаецца з раскрыццём сэнсу рэчаў-сімвалаў, значэнняў, якія продкі надавалі пэўнай прасторы ў доме. У інтэр'еры музейныя прадметы згрупаваны так, каб адлюстраваць канкрэтную падзею і паказаць звязаныя з гэтым уяўленні.

Аўтары дэманструюць нараджэнне чалавека, вяселле, пахаванне. Праз свята Купалля асэнсаваны этап жыцця, калі маладыя людзі маглі пазнаёміцца, сфарміраваць новыя пары. Можна ўбачыць святочна ўпрыгожанае стужкамі кола, адпаведныя фотаздымкі, прадстаўлены перыяд падрыхтоўкі да вяселля праз жаночыя заняткі (апрацоўка лёну, ткацтва, вышыўка).

Мужчынскія справы адлюстраваны праз характэрныя для рэгіёна рамёствы і промыслы: рыбная лоўля, бортніцтва, паляванне, бондарства, ганчарства. Акрамя таго, праз прылады працы і фотаздымкі паказаны найважнейшы занятак мужчыны – земляробства. Адзін з экспазіцыйных

комплексаў, а таксама апошняя зала музея – доўгі вузкі калідор – сімвалізавалі завяршальны этап жыцця, падрыхтоўку да пераходу, па ўяўленнях беларусаў, у іншы свет.

Арыгінальна былі вырашаны ў экспазіцыйнай прасторы нават змешчаныя там тэксты. Стваральнікі калекцыі адмовіліся ад класічнага этыкетажу, а ўключылі ў экспазіцыйную прастору вытрымкі з фальклорных тэкстаў, якія ілюструюць адпаведныя раздзелы.

Тэма беларускай міфалогіі ў апошнія гады выклікае ўсё большую цікавасць у патэнцыйных наведвальнікаў музеяў – турыстаў, таму становіцца нагодай для стварэння раздзелаў экспазіцый або нават асобных музеяў дадзенай тэматыкі. Так, у 2014 г. у аг. Заронава (Віцебскі раён) у народным музеі «Гісторыя Заронаўскага краю» адкрыліся дзве залы, прысвечаныя беларускай міфалогіі, галоўным чынам «нячысцікам». У 2017 г. у Бярэзінскім біясферным запаведніку сумесна з грамадскім аб'яднаннем «Адпачынак у вёсцы» быў створаны цэнтр міфалагічнага турызму. Пры ім адчыніў свае дзверы для наведвальнікаў своеасаблівы Музей міфаў, дзе ўвага сканцэнтравана на традыцыйных уяўленнях аб светабудове і навакольным асяроддзі.

## Культурна-адукацыйная дзейнасць і НКС

Культурна-адукацыйная дзейнасць – адзін з асноўных накірункаў музейнай справы, што ажыццяўляецца ў непасрэдным кантакце носьбіта з аўдыторыяй. Толькі такім чынам можа адбыцца перадача нематэрыяльнай спадчыны. Таму гэты накірунак музейнай працы можна лічыць адным з самых перспектыўных з пункту гледжання захавання НКС.

Эфектыўнай формай культурна-адукацыйнай дзейнасці, якая можа гэтаму спрыяць, а таксама дапамагаць непарыўнай перадачы традыцый і ведаў, з'яўляецца праца музейных аб'яднанняў. Напрыклад, пры Браслаўскім раённым аб'яднанні музеяў з 1984 г. дзейнічае клуб народных майстроў «Ля возера» [15]. У яго склад ўваходзяць супрацоўнікі музея, мастакі, мясцовыя майстры – носьбіты НКС. Удзельнікі клуба захоўваюць традыцыі саломапляцення, выцінанкі, кавальства, ткацтва, дрэваапрацоўкі, ганчарства і інш. Адметна тое, што пры гэтым адбываецца перадача традыцый ад носьбітаў да музейных супрацоўнікаў, якія самі робяцца носьбітамі НКС. Так, супрацоўніца музея А.У. Кавальчык пераняла ткацкае майстэрства ад мясцовага майстра.

Як і ў выпадку з дакументаваннем, культурна-адукацыйная дзейнасць у сферы НКС больш паспяховая там, дзе існуюць доўгатэрміновыя планы работы і адукацыйныя праграмы.

Супрацоўнікамі Веткаўскага музея стараабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава яшчэ ў 1986 г. была распрацавана праграма заняткаў школы старажытнай і сучаснай народнай культуры (па матэрыялах мясцовай традыцыі), разлічаная на працяглы перыяд – 12 гадоў навучання. Даследчыкі музея планавалі таксама ахапіць працу з дзецьмі ва ўзросце 5–17 гадоў. Аўтар ідэі і стваральнік адпаведнай праграмы – тагачасны дырэктар музея Г.Р. Нячаева. У аснову навучання пакладзены «культуралагічны падыход да засваення матэрыяльнай і духоўнай спадчыны ў канкрэтным кантэксце традыцыйнай культуры». Тэматыка курса разлічана на 37 гадзін і дазваляе засвоіць цэлы пласт традыцыйнай культуры рэгіёна, у тым ліку і НКС. Вучні знаёмяцца з тэхнікамі апрацоўкі дрэва, значэннем колераў і арнаментаў, ткацтвам, уяўленнямі аб светабудове, народнай кулінарыяй і інш. Частка заняткаў праходзіла з удзелам носьбітаў НКС (майстроў, выканаўцаў народных песень). Асноўнымі метадамі навучання музейныя супрацоўнікі выбралі гульню і моўнае мысленне.



Філіял Веткаўскага музея, г. Гомель. Майстар-клас па ткацтве


Супрацоўнікі Веткаўскага музея стараабраднiцтва i беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава падчас экспедыцыі


Мотальскі музей народнай творчасці. Фрагмент экспазіцыі


Мотальскі музей народнай творчасці. Носьбіты традыцыі


Мотальскі музей народнай творчасці.
Экскурсія ў суправаджэнні традыцыйных спеваў

У Івянецкім музеі традыцыйных культур распрацавана доўгатэрміновая праграма аднаўлення традыцыйных рамёстваў «Вяртанне да вытокаў» (1995 г.). Падчас яе рэалізацыі пры музеі быў створаны Цэнтр рамёстваў. З 2016 г. там дзейнічаюць 4 майстэрні: ткацтва, ганчарства, кузня, майстэрня па апрацоўцы драўніны. На базе іх працуюць гурткі, у якіх навучэнцы пераймаюць ад майстроў адпаведныя ўменні і навыкі, праходзяць асобныя музейна-педагагічныя заняткі. Чатыры разы арганізоўвалася абласное свята-конкурс «Гліняны звон», мэтамі якога, сярод іншага, з'яўляліся «прапаганда і папулярызацыя народнай керамікі» і «заахвочванне дзяцей і моладзі да заняткаў традыцыйнымі рамёствамі».

Калектыў Дрыбінскага гісторыка-этнаграфічнага музея ў 2007 г. распрацаваў спецыялізаваную культурна-адукацыйную праграму «Вывучэнне, захаванне і папулярызацыя шапавальства – народнага рамяства Дрыбіншчыны» з мэтай яго адраджэння і захавання пераемнасці. Яна была скіравана на захаванне элемента НКС, а адной з задач было «знаёмства дзяцей з майстрамі-шапаваламі». Праграма прадугледжвае 7 музейна-педагагічных заняткаў, якія паслядоўна раскрываюць тэмы: «Падарожжа ў мінулае», «Катрушніцкі лемязень», «Старажытныя сакрэты», «Прылады працы шапавалаў», «Асартымент: што можна зваляць з воўны», «Зазірнем у працэс стварэння вырабаў», «Валяны авангард». Асаблівай увагі заслугоўвае тое, што з мэтай паспяховай рэалізацыі праекту пры музеі стварылі клуб «Шапавал», у склад якога ўвайшлі непасрэдныя носьбіты рамяства і ўсе зацікаўленыя.

З мэтай перадачы НКС у 2009 г. кіраўніцтва Дрыбінскага гісторыка-этнаграфічнага музея арганізавала дзіцячае аматарскае аб'яднанне «Катрушнік», удзельнікі якога засвойваюць тэхналогію сухога і мокрага валяння, вывучаюць гісторыю і асаблівасці шапавальства Дрыбіншчыны, а таксама вырабляюць валёнкі, сувенірную прадукцыю, цацкі і інш. Перыядычна адбываюцца сустрэчы ўдзельнікаў дзіцячага аб'яднання з майстрамі клуба «Шапавал», што спрыяе

пераемнасці ў дзейнасці аб'яднанняў, дыялогу паміж носьбітамі НКС розных пакаленняў.

Беларускія музеі арганізоўваюць і разнастайныя летнія школы, майстар-класы, што знаёмяць іх удзельнікаў з элементамі нематэрыяльнай культурнай спадчыны, спрыяюць іх перадачы.

У 2010 г. на базе Гудзевіцкага дзяржаўнага літаратурна-краязнаўчага музея быў рэалізаваны праект «Майстэрня: падвойнае ткацтва», у якім удзельнічалі студэнты і аспіранты БДУКіМ, члены Студэнцкага этнаграфічнага таварыства. Мэтай было тэарэтычнае і практычнае засваенне элемента НКС, а менавіта тэхналогіі падвойнага ткацтва. У 2016 г. на базе музея праходзіла летняя школа пад назвай «Майстэрня падвойнага ткацтва». Заняткі былі разлічаны як на мясцовых жыхароў, так і на ўдзельнікаў Студэнцкага этнаграфічнага таварыства, майстроў па ткацтве з г. Гродна, якія імкнуліся засвоіць тэхналогію цягам заняткаў з дэманстрацыяй усяго працэсу ад снавання да вырабу тканіны [10].

Нематэрыяльная спадчына Беларусі актыўна ўключаецца ў поле дзейнасці музеяў. Разгледжаныя прыклады паказваюць, што яны паспяхова займаюцца дакументаваннем, вывучэнем, інтэрпрэтацыяй самых розных галін НКС. На музейную працу ўплывае спецыфіка музея як установы, якая гістарычна перш за ўсё імкнулася захоўваць артэфакты. Акцэнт на прадмеце не заўсёды дазваляе працаваць з «жывой спадчынай». У такім выпадку размова ідзе пра адлюстраванне значнасці і культурнага кантэксту пэўных элементаў НКС. Такая работа спрыяе павышэнню асвядомленасці аб нематэрыяльнай спадчыне і таксама павінна ажыццяўляцца.

Найбольшыя магчымасці для захавання НКС паказвае культурна-адукацыйная дзейнасць. Доўгатэрміновыя адукацыйныя праграмы, цыклы заняткаў, сталая праца музейных аб'яднанняў спрыяюць трансляцыі ведаў, навыкаў і ўменняў, звязаных з НКС, новым носьбітам. Гэты кірунак патрабуе пошуку новых форм культурна-адукацыйнай работы і ўдасканалення існуючых.

Змяншэнне колькасці сельскага насельніцтва, працэсы глабалізацыі і сацыяльна-эканамічная нестабільнасць у свеце негатыўна ўплываюць на захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны. У працэс яе зберажэння мусяць уключацца новыя сацыякультурныя інстытуты, у тым ліку і музеі.

**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**


1. The states parties to the Convention for the Safeguarding of the Intangible Cultural Heritage (2003). UNESCO, ICH // https://ich.unesco.org/en/states-parties-00024.
2. Official list in chronological order // Official website of The Intangible Cultural Heritage // http://www.unesco.org/eri/la/convention.asp? KO=17116&language=E.
3. Основные тексты Международной конвенции об охране нематериального культурного наследия. – Париж, 2020.
4. Shanghai Charter // Official website of ICOM // http://archives.icom.museum/shanghai_charter.html.
5. Seoul Declaration of ICOM on the Intangible Heritage // Official website of ICOM //http://icom.museum/the-governance/general-assembly/resolutions-adopted-by-icoms-general-assemblies-1946-to-date/seoul-2004.
6. ICOM Statutes // Official website of ICOM //http://archives.icom.museum/statutes.html#2.
7. Матэрыялы анкетнага апытання па тэме: «Дзейнасць музеяў Рэспублікі Беларусь па ахове і папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў 1991–2016 гг. Брэцкая вобласць» // Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. Ф. 9. – Воп. 5. – Спр. 36. Л. 35.
8. Никифорова А.Л. Редкие технологии на Браславщине. Синелька / А.Л. Никифорова // Народны тэкстыль і адзенне Віцебшчыны: матэрыялы навук.-практ. канф., Лепель, снеж. 2013 г. / Віцеб. абл. метад. цэнтр нар. творчасці; рэдкал.: Л.У. Вакар [і інш.]. – Мінск, 2014. С. 116–119.
9. Гісторыя // Веткаўскі музей стараабраднiцтва і беларускіх традыцый // http://vetka-museum.by/ab-muzei/gistoryya-muzeya.html.
10. Матэрыялы анкетнага апытання па тэме: «Дзейнасць музеяў Рэспублікі Беларусь па ахове і папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў 1991–2016 гг. Гродненская вобласць» // Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. Ф. 9. – Воп. 5. – Спр. 39. Л. 32.
11. Вясельная каравайная традыцыя вёскі Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці // Жывая спадчына Беларусі: інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны // http://livingheritage.by/nks/3353/?sphrase_id=49706.
12. Eighth session of the Intergovernmental Committee (8.com) – from 2 to 7 December 2013, Baku, Azerbaijan // UNESCO, ICH. //https://ich.unesco.org/en/8com.
13. О Столинском районном краеведческом музее // Учреждение культуры «Столинский районный краеведческий музей» // http://stolin.museum.by/node/41014.
14. Музеі Беларусі / рэд. савет: Г.П. Пашкоў, Л.В. Календа, М.Г. Нікіцін. – Мінск, 2008.
15. Касцюкевіч С. Дзейнасць народных майстроў Браслаўшчыны / С. Касцюкевіч // Браслаўскія чытанні: матэрыялы VI навук.-краязн. канф., прысвеч. 150-й гадавіне з дня нараджэння брасл. лекара, грамад. дзеяча С. Нарбута (1853–1926), 7–8 мая 2003 г. / Брасл. музейн. аб'яд-не, Брасл. краязн. т-ва; рэд. рада: К. Шыдлоўскі [і інш.]. – Браслаў, 2003. С. 50–52.